УДК 236

# ЭСХАТАЛАГІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ СТАРААБРАДЦАЎ: ПА МАТЭРЫЯЛАХ РУКАПІСНЫХ КНІЖНЫХ ПОМНІКАЎ XVIII–XIX стст. З ФОНДУ ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ

**Колас Радзівон Аляксандравіч**
Цэнтр даследавання старадрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

*На падставе даследавання стараабрадчых рукапісных помнікаў (зборнікаў, выпісак, палемічных твораў, сінодзікаў) XVIII–XIX стст. аўтар вызначае асноўныя характарыстыкі і асаблівасці эсхаталагічных уяўленняў тоесных стараабрадчаму ассяродзю. Мэтай артыкула з'яўляецца вылучэнне найбольш адметных рысаў і іх праяваў у стараабрадчым успрыняцці замагільнага жыцця.*

Эсхаталагічныя ўяўленні з'яўляюцца адной з цэнтральных тэмаў у разгортванні хрысціянскага палемічнага дыскурсу, асабліва паміж стараабрадцамі і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*«новаабрадцамі»*. Традыцыйная і першапачатковая сістэма хрысціянскай эсхаталогіі абапіралася на чатыры *«ἔσχατος»*: смерць, суд, рай і пекла; згодна за гэтай сістэмаю, эсхаталогія займаецца тлумачэннем выключна падзеяў, якія адбываюцца пасля смерці [1, с. 8]. З развіццём хрысціянскай думкі, асабліва ў часы Сярэднявечча, паступова адбываюцца працэсы *«belles lettres»* і *«naturals»* эсхаталагічных успрыняццяў: апакаліптычныя сюжэты набываюць мастацкую афарбоўку, часта можна назіраць выкарыстанне прыёмаў персанафікацыі, а таксама адлюстраванне побытовых рэчаў. Далейшае асаблівае развіццё гэтых тэндэнцыі атрымалі менавіта ў стараабрадчым ассяродзі [2, с. 19].

Для страабрадчага ассяродзя ў XVIII–XIX стст. галоўнымі *«fabulae»* раскрыцця эсхаталагічных уяўленняў сталі сюжэты знаходжання душы ў замагільным свеце, якія часта змяшчаліся ў Сінодзіках; выпіскі і пераасэнсаванне Апакаліпсісу Яна Багаслова; самастойныя творы з разважаннямі аб скванчэнні свету; палемічныя творы аб прышэсці антыхрыста.

Уласныя стараабрадчыя творы, якія раскрываюць сюжэты знаходжання душы чалавека ў замагільным свеце займаюць асаблівае месца ў *«новаставальнай»* хрысціянскай экзігезе [6, с.183]. Так у адным з Сінодзікаў 30-х гг. XVIII ст. мы знаходзім выяўленчае адлюстраванне і тэкставае тлумачэнне чыннікаў патрапляння душы чалавека ў пекла пасля суда: *«Аще кого дѹ|ша ѿидетъ свѣта сего, ї ѡставит | богатество женѣ своей, или дѣтѧм, или ближнимъ прїѧтелемъ своим | и прикажетъ имъ по себѣ добрѣ|оуправлѧти, и памѧти творити, | пространно и доволно, и ѡнѣ непра|веднїи, могли бы по смерти его | и в четыри десѧтихъ днехъ [дою|рочинъ] дѹшѣ его помощъ велїю | сотворити и мѹки вѣчныѧ изба|вити || и ѿ ада извести»*. Выява «стѧжанїѧ» душы між дзвух дрэў, змешчаная ў Сінодзіку, утрымлівае наступныя *«personae dramatis»*: *«А древо сребрѧное стѧжанїе богатыхъ | аще много соберетъ и болѣ того хощет | собрати»; «А златое ж древо хотѣнїе есть многаго бога|[те]ства[хъ] дабы и злато собралъ | [мн]ого, а не иматъ сытости»; «А в(о)ранъ приносѧ к немѹ углїе ѡгненое и всѧкѹ нечистатѹ, то есть дїѧволъ разжигаѧ ч(е)л(ове)ки на сребролюбїе и на всѧ непрїѧзненаѧ дѣла»; «Агглъ (о) г(о)нь приносѧ емѹ бл(а)гїѧ помыслы на с(е)рдце ч(е)л(ове)кѹ и скорбѧ ѡ грѣхѣ его»* [9, арк. 83, 87].

Вартымі ўвагі ўяўляюцца выпіскі з Апакаліпсісу Яна Багаслова канца XVIII ст., на падмурку якіх у стараабрадчым ассяродзі таксама адбывалася своеасаблівая *«(re)construere»* эсхаталагічных уяўленняў: падаецца апісанне пакутаў, называецца дакладная дата прышэсця антыхрыста [10, арк.1, 33]. Неабходна заўважыць, што ў самім Апакаліпсісе, або Адкравенні святога Апостала Яна Багаслова (20:18–19) накладаецца забарона на рэдагаванне тэкста гэтай кнігі: *«Сосвидѣтелствую бо всякому слышащему словеса пророчества книги сея: аще кто приложитъ къ симъ, наложитъ Богъ на него язвъ написанныхъ въ книзѣ сей: и аще кто отъиметъ от словесъ книги пророчествія сего, отъиметъ Богъ часть его от книги животныя, и от града святаго, и написанныхъ въ книзѣ сей»* [5, с. 532].

Характэрным і вельмі своеасаблівым пластам стараабрадчых эсхаталагічных уяўленняў з'яўляюцца багатыя і шырокія творы аб прышэсці антыхрыста. Час-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цей за ўсё гэтыя творы падаюцца ў форме «Замѣчанїи ѡ антихристѣ», а сэнсавым пачаткам з’яўляецца «*preambule*»: «*Антихристъ ѿ колѣна данова по плоти произыдетъ и родитсѧ*» [8, с. 1]. Гэтыя апавяданні, галоўным чынам, утрымліваюць тлумачэнне сімвалаў і знакаў, якія прадказваюць прышэсце антыхрыста, а таксама змяшчаюць маральныя настаўленні, часта носяць характар тэалагічных трактатаў, збіраючых у сябе ўсе магчымыя звесткі і спасылкі як са Святога Пісання, так і з твораў Айцоў Царквы [3, с. 24–26].

Нягледзячы на распаўсюджаны наратыў, што да пачатку XIX ст. у эсхаталагічных уяўленнях стараабрадцаў на першае месца пачалі выходзіць палемічныя творы (на працягу 2-й паловы XVII ст. – захаванне дарэформенай экзігезы, у XVIII ст. – узнікненне літаратурнай апрацоўкі кананічных тэкстаў), а творы з наяўнасцю грамадска-палітычнай крытыкі зніклі [4, с. 91–93]. Падобныя меркаванні не зусім рэлевантныя, паколькі нават у палемічных творах канца XIX ст. сустракаецца працяг літаратурных традыцый («Сочиненіе старообрдца Алеѯеѧ Андреева ѡ пророкахъ | Иліи и Енохѣ и ѡ антихристѣ»), а таксама маргінальнае каментаванне з крытыкай расколу: «*Со времени московскаго собора бывшаго | 1666 и 1667 годахъ ц(е)рковь какъ | грековосточнаѧ такъ и рускаѧ воѡбще | ѿпала древнѧо бл(а)гочестїѧ и лишилась | божей бл(а)го(с)ти*» [7, арк. 115 ад.–136, ніжні форзац].

Такім чынам, на працягу XVIII–XIX стст. у рукапісных кніжных помнікаў стараабрадцаў займеліся праявы як літаратурнай апрацоўкі хрысціянскай экзікезы ў тэкстах танаталагічнага і палемічнага характару, так і адбывалася станаўленне новых уласных твораў, якія дазваляюць раскрыць і ўцяміць эсхаталагічную семантыку ўяўленяў гэтай канфесійнай групы.

## Літаратура


1. Essien, S.P. The Significance of Pauline Eschatology to the Ibibio Christians of Akwa Ibom State, Nigeria / S.P. Essien // World Journal of Innovative Research. – 2020. – Vol. 9, № 2. – P. 8–14.
2. Авдеева, Н. В. Эсхатология у старообрядцев-поповцев в первой половине XVIII в. / Н. В. Авдеева // История и археология : материалы III Междунар. науч. конф. (г. Санкт-Петербург, декабрь 2015 г.). – СПб : Свое издательство, 2015. – С. 18–20.
3. Александров, Д. А. Выписка из творений св. отцов и учителей церкви в русском переводе, а также из старопечатных древлеписьменных книг и сочинений духовных и светских писателей по вопросам веры и благочестия пререкаемым старообрядцами / Д. А. Александров. – СПб : «Православный путеводитель», 1907. – 376 с.
4. Григоренко, А. Ю. Эсхатология старообрядцев: социальный дискурс / А. Ю. Григоренко // Религия. Церковь. Общество. Исследования и публикации по теологии и религии. – Колбино : Теологический Институт Евангелическо-лютеранской Церкви Ингрии на территории России, 2014. – № 3. – С. 83–96.
5. Новый Завѣтъ. Спб. : Скрижаль, 2017. – 560 с.
6. Покровский, Н. Н. Путешествие за редкими книгами / Н. Н. Покровский. Новосибирск : ИД «Сова», 2005. – 344 с.
7. ЦДСВіР ЦНБ НАН Беларусі. Выпіскі з твораў і гутарак Паўла Прускага. Апашняя чвэрць XIX ст. П19-20/Нр29 Р 385, 203 арк.
8. ЦДСВіР ЦНБ НАН Беларусі. Заўвагі пра антыхрыста. Апошняя чвэрць XIX ст. П19-20/Нр33 Р 71, 28 арк.
9. ЦДСВіР ЦНБ НАН Беларусі. Зборнік стараабрадніцкі. 2-я чвэрць XVIII ст. П16-18/Нр11 Р 65, 93 арк.
10. ЦДСВіР ЦНБ НАН Беларусі. Зборнік стараабрадніцкі. Апошняя чвэрць XVIII–1-я чвэрць XIX стст. П19-20/Нр40 Р 83, 225 арк.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова